*В. У. Чараўко*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Наваполацк

*V. Charauko*
Polotsk State University, Novopolotsk

**УДК 351.853.3(476.5)+904:726.82(476.5)«14/18»**

# ВЫВУЧЭННЕПОЗНЕСЯРЭДНЕВЯКОВЫХПАХАВАЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ Ў СЯРЭДЗІНЕ 60-Х ГГ. XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

# STUDY OF LATE MEDIEVAL FUNERAL MONUMENTS OF THE BELARUSIAN DVINA REGION IN THE MIDDLE 60S OF THE 19TH – EARLY 20TH CENTURY

*Артыкул прысвечаны вывучэнню познесярэдневяковых пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння ў сярэдзіне 60-х гг. XIX – пачатку XX ст. На гэты час прыпадае дзейнасць Д. М. Струкава, А. М. Семянтоўскага, М. Ф. Кусцінскага, Ф. В. Пакроўскага, Е. Р. Раманава. Быў даследаваны шэраг познесярэдневяковых пахаванняў. Удасканалілася методыка палявых работ. Рэалізаваліся першыя спробы картаграфавання помнікаў. Але пахаванні Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. у дарэвалюцыйны час не сталі прадметам мэтанакіраванага даследавання. Паколькі XIV–XVIII стст. не ўваходзілі ў праблемнае поле тагачаснай археалагічнай навукі, пахаванні гэтага перыяду ў якасці асобнай катэгорыі помнікаў не разглядаліся.*

*Ключавыя словы: археалагічныя даследаванні; познесярэдневяковыя пахавальныя помнікі; Беларускае Падзвінне; гісторыя археалогіі Беларусі; гістарыяграфія археалогіі.*

*The article is devoted to the study of the late medieval funerary monuments of the Belarusian Dvina region in the mid-60s 19th – early 20th century. During this period, D. M. Strukov, A. M. Sementovsky, M. F. Kustinsky, F. V. Pokrovsky, E. R. Romanov were engaged in funerary monuments. A number of late medieval burials were investigated. The method of field work has been improved. The first attempts to map monuments were realized. But the burials of the Belarusian Dvina region of the 14th–18th centuries. in pre-revolutionary times did not become the subject of purposeful study. Since the monuments of the 14th-18th centuries were not included in the problematic field of the then archaeological science, the burials of this period were not considered as a separate category of monuments.*

*Keywords: archaeological research; late medieval funerary monuments; Belarusian Dvina region; history of archeology of Belarus; historiography of archeology.*

У канцы XVIII – першай палове 60-х гг. XIX ст. быў закладзены падмурак у справе археалагічнага вывучэння Беларусі. Акумулявалася інфармацыя аб археалагічных помніках, адбываліся першыя раскопкі, пачалася публікацыя палявых матэрыялаў і вынікаў іх абагульнення. Вывучэнне познесярэдневяковых пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння ў гэты час адбывалася ў пазначаным кантэксце. Агульнае развіццё археалагічных

ведаў патрабавала каардынацыі намаганняў даследчыкаў. Пляцоўкай, якая аб'яднала б мясцовых археолагаў-аматараў, магла стаць археалагічная камісія пры Віленскім музеі старажытнасцей, створаная ў 1855 г. Яўстафіем Тышкевічам. Яе ліквідацыя царскім урадам у 1865 г. замарудзіла працэс археалагічнага вывучэння Беларусі. Разам з тым вывучэнне мясцовых старажытнасцей не спынілася. Археалагічныя помнікі да сярэдзіны 1860-х гг. надзейна ўвайшлі ў кола рэчавых крыніц [1, с. 13; 2, с. 160; 3, с. 125, 127–128; 4, с. 61, 81–83].

Урадавая адміністрацыя неадназначна ставілася да краязнаўчых ініцыятыў прадстаўнікоў мясцовай польскай ці паланізаванай шляхты каталіцкага веравызнання нават пры ўмове іх актыўнага супрацоўніцтва з агульнарасійскімі вучонымі таварыствамі. Але краязнаўчая дзейнасць даследчыкаў з ліку праваслаўнага духавенства, дваранства, чыноўнікаў і афіцэраў не сустракала перашкод. Тое ж можна сказаць аб камандзіраваных у беларускія губерніі прадстаўніках агульнарасійскіх навуковых таварystваў. У 1864 г. Рускае археалагічнае таварыства ў Пецярбургу атрымала сродкі для арганізацыі «экскурсій» (экспедыцый) для пошуку «рускіх і праваслаўных памятных мясцін» Паўночна-Заходняга краю [4, с. 93]. У тым жа годзе для выяўлення, апісання і графічнай фіксацыі помнікаў даўніны ў беларускія землі быў камандзіраваны мастак Маскоўскай Аружэйнай палаты Дзмітрый Міхайлавіч Струкаў (1828–1899). У далейшым у 1860–1890-х гг. ён неаднаразова наведваў беларускія губерніі па заданнях Рускага археалагічнага таварыства або па ініцыятыве папячыцеля Віленскай навучальнай акругі П. М. Бацюшкава. Вынікам маштабнай экспедыцыйнай дзейнасці Д. М. Струкава сталі шматлікія малюнкі, прыкладзеныя да справаздач [4, с. 93–94; 5, с. 515].

Прыярытэт пры гэтым надаваўся вывучэнню помнікаў і артэфактаў старажытнарускага часу, што мусіла садзейнічаць урадавай палітыцы. Д. М. Струкаў разумеў мэту «экспедыцый» больш шырока. Ён замалёўваў не толькі старажытнарускую спадчыну. Мастак шукаў і адлюстраванне старажытнарускіх архітэктурных і мастацкіх традыцый у помніках пазнейшага часу. Наяўнасць сярод малюнкаў Д. М. Струкава выяў аб'ектаў, якія не мелі непасрэднага дачынення да гісторыі праваслаўнай царквы, не знаходзіла разумення ў мясцовай адміністрацыі [4, с. 93; 5, с. 513–514]. Е. Р. Раманаў меркаваў, што гэта тлумачылася слабой знаёмасцю мастака з Паўночна-Заходнім краем і яго гісторыяй [6, с. 239]. Але дзейнасць Д. М. Струкава адпавядала тагачаснаму «мастацтвазнаўчаму» напрамку ў расійскай археалогіі і падыходам, распрацаваным археалагічнымі таварыствамі ў Пецярбургу і ў Маскве [5, с. 513–514].

З познесярэдневяковых пахавальных помнікаў Д. М. Струкаў замаляваў адзін з двух крыжоў з шэрага каменю ў Экімані. На крыжах былі высечаны літары і выявы крыжоў [7, с. 16, 97]. На востраве Заходняй Дзвіны, які

знаходзіўся на рацэ паміж Экіманню і Сафійскім саборам і быў заняты агародам Кадэцкага корпуса, мастак заклаў 2 шурфы. На глыбіні каля 1,8 м ён выявіў чалавечыя косці [7, с. 16, 100–101]. Іх можна звязаць з вядомым па пісьмовых крыніцах манастыром Іаана Прадцечы. Невялікія раскопкі Д. М. Струкаў правёў таксама ў ваколіцах Віцебска, на адлегласці 2 вёрст ад якога знаходзіўся зачынены касцёл, а раней была праваслаўная Барысаглебская царква. У трох месцах на глыбіні каля 1 м сустрэліся чалавечыя косці [7, с. 18].

Шукаючы патрэбны матэрыял, мастак аглядаў сутарэнні старых будынкаў [5, с. 513]. У сутарэннях аднаго з храмаў Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра ў Полацку Д. М. Струкаў бачыў некалькі трун з пахаваннямі. Труны былі моцна пашкоджаны вадой, што знаходзілася ў склепе. Па словах настаяцеля манастыра, адно пахаванне, што захавалася лепш за астатнія, магло належаць памерламу ў пачатку XIX ст. архімандрыту Кіпрыяну [7, с. 16]. Трэба меркаваць, што астатнія пахаванні належалі духоўным асобам, памерлым не пазней за другую палову – канец XVIII ст. Шматлікія непахаваныя косці мастак заўважыў і ў сутарэннях полацкага касцёла Узнясення [7, с. 14].

У 1860-х гг. да вывучэння мясцовых старажытнасцей далучыўся сакратар Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта Аляксей Максімавіч Семянтоўскі (1823–1893), які супрацоўнічаў з Археалагічным таварыствам у Маскве. У кнізе «Помнікі даўніны Віцебскай губерні» (1867) ён змясціў апісанне помнікаў і надрукаваў першую археалагічную карту беларускіх земляў [4, с. 97; 8]. Самастойных раскопак ён не праводзіў, але актыўна займаўся разведкамі і часам браў удзел у раскопках іншых даследчыкаў [4, с. 97, 99].

Звесткі аб познесярэдневяковых пахаваннях у «Помніках даўніны…» адсутнічаюць, але занатаваны звычай беларусаў Падзвіння класці ў труну разам з нябожчыкам асабістыя рэчы. Гэты звычай звязваецца з язычніцкімі перажыткамі [8, с. 56]. У 1890 г. А. М. Семянтоўскі выдаў кнігу «Беларускія старажытнасці» [9]. Яе аснову склаў матэрыял «Помнікаў даўніны…», дапоўнены новымі звесткамі [4, с. 99]. Аўтар паведаміў, што пры закладанні падмурка царквы ў в. Веляшковічы (сучасны Лёзненскі раён) у 1872 г. былі адкрыты некалькі дзесяткаў пераадкладзеных пахаванняў. Глыбіня іх залягання складала каля 2,1–2,8 м ад узроўня дзённай паверхні. Часткова захаваліся труны, у якіх былі выяўлены манеты, а таксама шкляныя сасуды, «падобныя на бакалы» [9, с. 28]. А. М. Семянтоўскі прама не кажа пра парушанасць пахаванняў, аднак выкарыстаныя ім выразы («чалавечыя галовы», «шмат касцей») сведчаць менавіта аб гэтым.

У «Беларускіх старажытнасцях» змешчана паведамленне аб раскопках двух курганоў каля в. Крывец Лепельскага павета. Пахаванне ў ад-

ным з іх утрымлівала манету XVI ст. [9, с. 27–28]. Раскопкі праводзіў Міхаіл Францавіч Кусцінскі (1829–1905). Ён быў мясцовым памешчыкам і актыўным археолагам-аматарам, працаваў над археалагічнай картай Віцебскай губерні, праз свайго сакурсніка А. С. Уварава падтрымліваў сувязі з археолагамі Санкт-Пецярбурга і Масквы [4, с. 116–117; 10, с. 359]. У 1903 г. М. Ф. Кусцінскі апісаў даследаванне познесярэдневяковага курганнага пахавання з манетай. Курган знаходзіўся каля маёнтка Забалоцце Лепельскага павета [11]. Нягледзячы на несупадзенні ў паведамленнях А. М. Семянтоўскага і М. Ф. Кусцінскага, маюцца падставы сцвярджаць, што абодва аўтара апісвалі адны і тыя ж раскопкі [12, с. 272–273; 13, с. 160–162]. На сённяшні момант гэта адзінае вядомае курганнае пахаванне на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, якое ўпэўнена вызначаецца як познесярэдневяковае.

Недалёка ад возера Пола і дарогі паміж Улай і замчышчам Суша, на полі каля маёнтка Сокарава М. Ф. Кусцінскі адшукаў гранітны крыж з надпісам XVI ст. [14, с. 92–93]. Крыж меў каля 1,2 м у вышыню, каля 0,9 м у шырыню, размяшчаўся на невысокім узвышшы і быў да паловы заглыблены ў зямлю. Надпіс на крыжы ўтрымліваў дату (1569 г.) і ўказанне на пахаванне «200 жовнеров», таму даследчыкам была зроблена выснова аб брацкай магіле вайскоўцаў [14, с. 93]. Надрукаваная ў «Старажытнасцях» Маскоўскага археалагічнага таварыства ў 1874 г. публікацыя М. Ф. Кусцінскага змяшчала не толькі тэкст, але і прамалёўку надпіса на крыжы [14, с. 93]. У публікацыі 1882 г. М. Ф. Кусцінскі прывёў і прамалёўку крыжа [15, с. 36–37]. У «Беларускіх старажытнасцях» А. М. Семянтоўскага ёсць яшчэ адзін малюнак крыжа з прамалёўкай надпіса [9, с. 54].

У 1882 г. інфармацыю аб тым жа крыжы ў нарысе «Беларускае Палессе» (у складзе III тома «Жывапіснай Расіі») прывёў Адам Кіркор (1818–1886) – актыўны дзеяч колішняй Віленскай археалагічнай камісіі [16, с. 248].

У 1890-х гг. вывучэнне старажытнасцей у беларускіх губернях актывізавалася, што звязана з правядзеннем IX Археалагічнага з’езда [4, с. 131–132; 17, с. 209–210]. Археалагічныя з’езды ў Расійскай імперыі прысвячаліся важным у навуковым плане, але недастаткова даследаваным тэрыторыям. IX Археалагічны з’езд было вырашана прысвяціць «заходнерускім» землям і правесці ў 1893 г. у Вільні. У 1891 г. быў створаны Папярэдні камітэт IX з’езда і яго Віленскае аддзяленне [4, с. 131–132; 17, с. 99, 209]. Прызнавалася неабходным стварыць археалагічныя карты губерній «Паўночна-Заходняга краю», правесці раскопкі на некаторых помніках і сабраць звесткі аб прыватных калекцыях. Звесткі аб помніках збіраліся ў адпаведнасці з праграмай, якая ўтрымлівала асобныя пункты адносна знаходак касцей, каменных крыжоў, старых могілак [4, с. 132–133; 18, с. 22, 30; 19, с. 24–25]. Пасля вывучэння атрыманых адказаў дапоўненая

рэдакцыя праграмы зноў была разаслана на месцы. Яе агульны наклад склаў каля 9 000 экзэмпляраў. Атрымальнікамі сталі чыноўнікі, духавенства, памешчыкі, настаўнікі [18, с. 22; 19, с. 25; 20, с. 3].

Да IX Археалагічнага з'езда загадчык Віцебскага цэнтральнага архіва Міхаіл Лаўрэнцевіч Вяроўкін (1825–1896) падрыхтаваў грунтоўную «Запіску аб археалагічных помніках Віцебскай губерні» [18, с. 187–224]. «Запіска…» ўяўляла сабой выпіскі з дакументаў Віцебскага цэнтральнага архіва са звесткамі аб археалагічных помніках, у тым ліку аб пахавальных. Напрыклад, у дакументах за 1569 і 1632 гг. фігуруе размешчаны каля Пышніцкага маёнтка каменны крыж, які знаходзіўся на могілках ці побач з імі [18, с. 190–191, 214]. Са спасылкай на «ўраджэнца Магілёўскай губерні» паведамлялася аб знаходцы сялянамі на полі каля Лукомля каменнага крыжа, які моцна ўрос у зямлю [18, с. 190–191, 218].

Вынікам картаграфавання помнікаў сталі падрыхтаваныя захавальнікам Віленскага музея Фёдарам Васільевічам Пакроўскім (1855–1903) археалагічныя карты Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерній, надрукаваныя адпаведна ў 1893, 1895 і 1899 гг. [20; 21; 22]. Матэрыял Ф. В. Пакроўскі браў як з апублікаваных крыніц і даследаванняў, так і сістэматызуючы адказы на пытанні згаданай праграмы. Найбольш актыўнымі аказаліся настаўнікі народных школ. Матэрыялы таксама дасылалі праваслаўныя святары, валасныя пісары, ляснічыя [20, с. 3; 21, с. VII]. У археалагічных картах Ф. В. Пакроўскага сустракаюцца асобныя звесткі аб познесярэдневяковых пахавальных помніках Беларускага Падзвіння. У «Археалагічнай карце Віленскай губерні», напрыклад, узгадваюцца старажытныя могілкі з вялікім каменем у мястэчку Глыбокім; знаходкі чалавечых касцей і кавалкаў шабель каля в. Залескія; руіны уніяцкай царквы з могілкамі ў двух вёрстах ад в. Зябкі і г. д. [21, с. 9–10, 13].

Інспектар народных вучылішчаў Еўдакім Раманавіч Раманаў (1855–1922) склаў інструкцыю па арганізацыі археалагічных экспедыцый – «Кароткія ўказанні для здзяйснення археалагічных экскурсій сярэднімі навучальнымі ўстановамі Віленскай навучальнай акругі» [23]. У склад гэтай акругі тады ўваходзілі беларускія землі. Інструкцыя рэкамендавала навучальным установам размяркоўваць тэрыторыю, дзе планаваліся экспедыцыі. Е. Р. Раманаў настойваў не толькі на абавязковым вядзенні справаздач, але і на іх публікацыі [23, с. 4–5]. Ён імкнуўся заахвоціць да пошуку і апісання помнікаў сельскую інтэлігенцыю і наракаў на яе несвядомасць у гэтай справе і недастатковую актыўнасць [24, с. 18].

Карты Ф. В. Пакроўскага даследчык лічыў недасканалымі, таму вёў уласную работу па картаграфаванню помнікаў, у тым ліку і на тэрыторыі Віцебскай губерні [4, с. 146; 23, с. 1]. Ён распрацаваў падрабязную класіфікацыю археалагічных аб'ектаў Беларусі і звярнуў увагу на каменныя

крыжы [17, с. 210]. Даследчык упершыню вылучыў у асобную катэгорыю археалагічных помнікаў грунтовыя могільнікі («звычайныя пахаванні», або «могільнікі без знешніх прыкмет») і прапанаваў методыку іх раскопак [25, с. 51].

У складанні археалагічнай карты Віцебскай губерні ўдзельнічаў і архіварыус Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актаў Аляксей Парфенавіч Сапуноў (1851–1924) [17, с. 210]. У «Матэрыялах па гісторыі і геаграфіі Дзісненскага і Вілейскага паветаў» (1896) ён паведамляў аб могілках, якія дзейнічалі ў XVIII ст. у Дзісне і забудаваны пасля таго, як у вайну 1812 г. згарэла царква на іх [26, с. 85]. Там жа ёсць інфармацыя аб пахаванні ў XVII ст. Льва Корсака і яго жонкі ў Беразвецкай праваслаўнай царкве і прыведзены надпіс над адной з ніш у склепе пад Глыбоцкім касцёлам кармелітаў, што ўказвае на пахаванага [26, с. 96, 104]. У рабоце «Помнікі часоў старажытных і навейшых» (1903) А. П. Сапуноў перадрукаваў ужо вядомыя звесткі аб каменным крыжы каля маёнтка Сокарава і яго малюнак, запазычаны ў М. Ф. Кусцінскага [8, с. 49–50; 15, с. 36–37]. У 1912 г. А. П. Сапуноў па запрашэнні мясцовых улад ажыццяўляў экспертызу выпадкова адкрытага ў Полацкім Сафійскім саборы пахавання [27].

У 1901 г. Леў Юльянавіч Лазарэвіч-Шапялевіч (1863–1909) агледзеў старыя могілкі з «каменнымі крыжамі прымітыўнай формы» каля в. Дубраўка Гарадоцкага павета. Старыя могілкі знаходзіліся побач з дзеючымі і курганнай групай. Археолаг-аматар правёў раскопкі «каменнай магілы» каля в. Дубраўка Гарадоцкага павета. На глыбіні каля 0,57 м ад узроўня дзённай паверхні ім былі выяўлены фрагменты керамікі, а на глыбіні каля 1,54 м – касцяк [28, с. 1]. У 2014 г. на згаданых могілках правёў раскопкі В. У. Чараўко [29].

У 1914 г. архітэктар і рэстаўратар Пётр Пятровіч Пакрышкін (1870–1921) ажыццяўляў архітэктурна-археалагічныя даследаванні каля Сафійскага сабора ў Полацку. З мэтай вывучэння падмуркаў старажытнага храма каля яго сцен была закладзена траншэя. На глыбіні каля 0,7 м сярод будаўнічага смецця пачалі трапляцца чалавечыя парэшткі і рэшткі трун. Касцякі пераважна мелі ўсходнюю або паўночную арыенціроўку. Акрамя шкілетаў дарослых людзей былі адкрыты тры дзіцячыя касцякі [30, с. 82].

У канцы XIX – пачатку XX ст. пазначаныя каменнымі канструкцыямі пахавальныя помнікі сумежнага з Беларускім Падзвіннем Панямоння даследаваў Вандалін Шукевіч (1852–1919). У 1893 г. у «Працах» Віленскага аддзялення Папярэдняга камітэта IX Археалагічнага з’езда быў апублікаваны яго рэферат «Аб археалагічных мясцовасцях у Лідскім і Трокскім паветах» [31]. У ім паведамлялася, што на захадзе Лідскага павета ў вялікай колькасці маюцца помнікі з народнымі назвамі «Татарскія магілы» і «Магілы веліканаў». Яны ўяўляюць сабой групы магіл, абазначаных

невялікімі каменнымі насыпамі авальнай або круглай формы; амаль заўсёды з аднаго ці з двух бакоў магіл знаходзіліся абцясаныя вялікія валуны. Глыбіня магільных ям складала 0,8–1,2 м, касцякі мелі заходнюю арыенціроўку, рукі складзены на жываце, грудзях або выцягнуты ўздоўж цела. Пахавальны інвентар прадстаўлены бытавымі рэчамі, зброяй, жаночымі ўпрыгажэннямі і манетамі XIV–XV стст. Пад камянямі надмагілляў сустракаліся фрагменты керамікі [31, с. 99–100].

Вынікі раскопак В. Шукевіч падрабязна апісаў у некалькіх артыкулах [32, s. 111; 33; 34]. Ён адзначыў, што «каменныя курганы» нагадваюць пахавальныя помнікі Падляшша, аднак адрозніваюцца будовай каменных канструкцый і пахавальным інвентаром. Каменныя надмагіллі могуць быць паўсферычнымі і авальнымі. На думку даследчыка, першыя з'яўляюцца больш старажытнымі, паколькі пахаванні пад імі багатыя на інвентар, але не ўтрымліваюць манет, а на высокіх камянях у галавах/нагах авальных надмагілляў часам высечаны крыжы [33, s. 32–34]. Археолаг не толькі прывёў замалёўкі знаходак, але і надрукаваў фотаздымак надмагілля і аднаго з пахаванняў [34, s. 43]. Астэалагічны матэрыял з раскопак В. Шукевіча вывучаўся антраполагам Юльянам Талька-Грынцэвічам [35].

У канцы XIX – пачатку XX ст. з'явіўся шэраг публікацый Аляксандра Андрэевіча Спіцына (1858–1931), прысвечаных пахаванням з каменнымі надмагіллямі, даследаваным у сумежных з Беларускім Падзвіннем рэгіёнах. У артыкуле «Сопкі і жальнікі» (1903) ён даў вызначэнне тэрмінам «жальнік» і «жальнічнае пахаванне», адзначыў іх размяшчэнне ў межах курганных груп, прасачыў магчымае развіццё гэтых помнікаў (ад абстаўленых буйнымі валунамі магіл Наўгародскага і Пскоўскага рэгіёнаў XI ст. да каменных абкладак з вялікімі камянямі ў галавах і/або нагах магілы, пашыраных у Пецярбургскім, Наўгародскім і Цвярскім рэгіёнах XII–XIV ст.) [36, с. 152–155]. Даследчык заўважыў падабенства наўгародскіх жальнікаў і каменных магіл у басейнах Буга і Нёмана, а таксама адзначыў наяўнасць такіх помнікаў каля Прыдруйска і ў Мінскай губерні ў вярхоўях Бярэзіны [36, с. 154–155]. У рабоце «Меркаваныя старажытнасці Чорнай Русі» (1903) А. А. Спіцын па выніках даследаванняў В. Шукевіча і Э. А. Вольтэра, апісаў каменныя магілы Беларускага Панямоння, пазначыўшы канструктыўныя асаблівасці надмагілляў, іх параметры, тыповы інвентар пахаванняў і прасачыўшы іх развіццё [37, с. 305–307, 309–310].

У інструкцыі «Выкананне археалагічных раскопак» (1896) А. А. Спіцын паводле фармальнай прыкметы ў асобную катэгорыю вылучыў «каменныя магілы, фігуры, пляцоўкі, кучы і ямы» – «усе помнікі старажытнасці, адзначаныя звонку шэрагамі або пляцоўкамі камянёў». Апісваючы ў межах гэтай групы каменныя магілы, археолаг рэкамендаваў пры раскопках звяртаць увагу на размяшчэнне камянёў і на знаходкі паміж імі або непасрэдна пад каменнымі канструкцыямі. Па словах даследчыка, каменныя канструкцыі

з цягам часу змяняюць свой выгляд. «У заходнім краі Расіі» яны могуць як мець правільныя геаметрычныя абрысы, так і ўяўляць хаатычнае скапленне камянёў [38, с. 40–41].

Нягледзячы на назапашванне матэрыялаў з познесярэдневяковых пахавальных помнікаў, у канцы XIX ст. расійскі археолаг Д. М. Анучын вызначыў для «Заходняй Расіі» храналогію пахавальных помнікаў наступным чынам: VI–X стст. адпавядаюць грунтовыя магілы без знешніх прыкмет або са слаба пазначанымі насыпамі, а IX–XIII стст. – курганы [39, с. 38–40]. Пахаванні пазнейшай эпохі не былі аднесены да археалагічных помнікаў.

Такім чынам, вывучэнне познесярэдневяковых пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння працягнулася ў сярэдзіне 60-х гг. XIX – пачатку XX ст. На гэты час прыпадае дзейнасць Д. М. Струкава, А. М. Семянтоўскага, М. Ф. Кусцінскага, Ф. В. Пакроўскага, Е. Р. Раманава, А. П. Сапунова і іншых даследчыкаў. Быў апісаны і раскапаны шэраг познесярэдневяковых пахаванняў. Матэрыялы гэтых раскопак былі апублікаваны ў мясцовых і цэнтральных профільных выданнях. Удасканалілася методыка палявых работ. Рэалізаваліся першыя спробы картаграфавання помнікаў.

Разам з тым, пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння ў дарэвалюцыйны час не сталі прадметам мэтанакіраванага археалагічнага даследавання, а іх вывучэнне было пераважна вынікам выпадковага выяўлення. Інфармацыя аб іх фіксавалася, але амаль не абагульнялася. Нягледзячы на тое, што некаторыя познесярэдневяковыя пахаванні былі адкрыты, у цэлым яны не ўспрымаліся як асобная катэгорыя археалагічных помнікаў, паколькі храналагічны перыяд XIV–XVIII стст. не ўваходзіў у праблемнае поле тагачаснай археалагічнай навукі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Алексеев, Л. В.* Полоцкая земля в IX–XIII вв. (Очерки истории Северной Белоруссии) / Л. В. Алексеев. – М.: Наука, 1966. – 295 с.

2. *Алексеев, Л. В.* Очерк истории белорусской дореволюционной археологии и исторического краеведения до 60-х годов XX в. / Л. В. Алексеев // Советская археология. – 1967. – № 4. – С. 146–163.

3. *Чараўко, В. У.* Вывучэнне познесярэдневяковых пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння ў сярэдзіне 40-х – сярэдзіне 60-х гг. XIX стагоддзя / В. У. Чараўко // Вестник Полоцкого гос. ун-та. Серия А. Гуманитарные науки. – 2021. – № 9. – С. 125–129.

4. *Алексеев, Л. В.* Археология и краеведение Беларуси: XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск: Беларуская навука, 1996. – 206 с.

5. *Баженова, О. Д.* Альбом рисунков Д. М. Струкова 1864 г. как источник по истории белорусской культуры: концепт и контекст альбома / О. Д. Баженова // Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси: к 90-летию создания Института белорусской культуры: материалы Междунар. науч. конф., Минск, 8–9 дек. 2011 г. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2012. – С. 510–515.

6. *Романов, Е. Р.* Альбом художника Д. М. Струкова как результат экспедиции по Северо-Западному краю в 1864 г. / Е. Р. Романов. – Вильна: Тип. И. Завадского, б.д. – 20 с.

7. *Струков, Д. М.* Альбом рисунков, 1864–1867 [изоматериал] / Д. М. Струков. – Минск: Белорус. Энцикл. им. П. Бровки, 2011. – 305 с.

8. *Сементовский, А. М.* Памятники старины Витебской губернии / А. М. Сементовский. – СПб.: Типография К. Вульфа, 1867. – II с. + 74 с.

9. *Сементовский, А. М.* Белорусские древности / А. М. Сементовский. – СПб.: Типолитография Н. Стефанова, 1890. – Вып. 1. – 136 с.

10. *Каробушкіна, Т. М.* Кусцінскі Міхаіл Францавіч / Т. М. Каробушкіна // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1993. – С. 359.

11. *Кусцинский, М. Ф.* Из заметок о курганах Лепельского уезда / М. Ф. Кусцинский // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1903. – № 7. – С. 232–235.

12. *Чараўко, В. У.* Вывучэнне пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. у дарэвалюцыйны перыяд / В. У. Чараўко // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2010. – Вып. 25. – С. 271–275.

13. *Чараўко, В. У.* Да пытання аб раскопках М. Ф. Кусцінскім познесярэдневяковых курганных пахаванняў у Лепельскім павеце / В. У. Чараўко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2011. – Вып. 21. – С. 160–162.

14. *Кусцинский, М. Ф.* Надгробный камень над павшими в сражении в 1568 г., найденный в Лепельском уезде Витебской губернии / М. Ф. Кусцинский // Древности. Труды Московского археологического общества. – М., 1874. – Т. IV. – С. 92–93.

15. Витебская старина / сост. А. П. Сапунов. – Витебск: Типолитография Г. А. Малкина, 1885. – Т. IV– IV с. + 274 с. + 394 с. + XII с.

16. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье: репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Минск: Белорус. энцикл. им. П. Бровки, 1993. – 550 с.; ил.

17. *Лебедев, Г. С.* История отечественной археологии. 1700–1971 гг. / Г. С. Лебедев. – СПб.: Изд-во С.-Петерб. ун-та, 1992. – 464 с.

18. Труды Виленского отделения Московского предварительного комитета по устройству в Вильне IX Археологического съезда. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1893. – XI с. + 170 с. + XVIII с. + 371 с. + 104 с.

19. Труды IX археологического съезда в Вильне. 1893 / под ред. граф. Уваровой и С. С. Слуцкого. Т. II. – М.: Типография Э. Лисснера и Ю. Романова, 1897. – VII с. + + 328 с. + 126 с.

20. *Покровский, Ф. В.* Археологическая карта Ковенской губернии / Ф. В. Покровский. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1899. – 161 с.

21. *Покровский, Ф. В.* Археологическая карта Виленской губернии / Ф. В. Покровский. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1893. – XVIII с. + 164 с.

22. *Покровский, Ф. В.* Археологическая карта Гродненской губернии / Ф. В. Покровский. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1895. – 165 с.

23. *Романов, Е. Р.* Краткие указания для совершения археологических экскурсий средними учебными заведениями Виленского учебного округа. Записка члена временной комиссии по устройству и управлению Виленской публичной библиотеки и музея / Е. Р. Романов. – Вильна: Б. и., 1910. – 14 с.

24. *Романов, Е. Р.* К археологии Северо-Западного края России / Е. Р. Романов. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1911. – 18 с.

25. *Клімаў, М. В.* Е. Р. Раманаў і праблема грунтовых могільнікаў Беларускага Падзвіння / М. В. Клімаў // «Открыть миру душу белоруса…»: зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-практ. канф., прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння Е. Р. Раманава, 25–26 кастр. 2005 г. / рэдкал.: А. Р. Яшчанка [і інш.]. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2005. – С. 51–54.

26. *Сапунов, А.* Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии / А. Сапунов, В. Друцкий-Любецкий. – Витебск: Губернская типолитография, 1896. – 262 с. + 144 с.

27. *Сапунов, А.* Чей прах покоится в нише полоцкого Софийского собора? (Доклад в ученой архивной комиссии) / А. Сапунов // Полоцко-Витебская старина. Издание Витебской ученой комиссии. – Витебск: Типолит. Насл. М. Б. Неймана, 1912. – Вып. II. – С. 351–358.

28. *Лазаревич-Шепелевич, Л. Ю.* Извлечение из отчета об исследованиях и раскопках, произведенных в 1901 г. в Витебской губернии / Л. Ю. Лазаревич-Шепелевич // Известия императорской археологической комиссии. – СПб.: Тип. главного управления уделов, 1904. – Вып. 6. – С. 1–5.

29. *Черевко, В. В.* Археологические исследования на могильнике возле д. Дубровка Городокского района в 2014 г. / В. В. Черевко // Вестник Полоцкого гос. ун-та. – 2016. – № 1. – С. 153–161. – (Серия А. Гуманитарные науки).

30. Полоцк. Археологические раскопки // Известия императорской археологической комиссии. Прибавление к вып. 52-му. – СПб.: Тип. главного управления уделов, 1914. – С. 82–83.

31. *Шукевич, В.* Об археологических местностях в Лидском и Трокском уездах / В. Шукевич // Труды Виленского отделения Московского предварительного комитета по устройству в Вильне IX Археологического съезда. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1893. – С. 96–100.

*32. Blomberg, M. M.* Badania archeologiczne Polaków na terenach Wielkiego Księstwa Litewskiego (XIX – początek XX wieku) / M. M. Blomberg // Archaeologia Historica Polona. – 2012. – T. 20. Regiony, rzemiosła, kategorie – archeologia późnego średniowiecza i czasów nowożytnych w uwarunkowaniach nowego ustroju. – S. 7–41.

33. *Szukiewicz, W.* Kurhany kamienne w powiece Lidzkim (gub. Wileńska) / W. Szukiewicz // Światowit. – 1899. – T. I. – S. 32–38.

34. *Szukiewicz, W.* Kurhany kamienne w pow. Lidzkim gub. Wileńskiej / W. Szukiewicz // Światowit. – 1902. – T. IV. – S. 40–45.

35. *Talko-Hryncewicz, J.* O domniemanych czaszkach Krywiczan. Studium antropologiczne / J. Talko-Hryncewicz // Materyały antropologiczno-archaeologiczne i etnograficzne. – Krakowie: Nakł. Akademii umiejętności, 1904. – T. VII. – W. – S. 3–43.

36. *Спицын, А. А.* Сопки и жальники / А. А. Спицын // Записки императорского русского археологического общества. Новая серия. Т. XI. Вып. 1–2. Труды отделения славянской и русской археологии. – СПб.: Тип. И. Н. Скороходова, 1899. – Кн. 4. – С. 142–155.

37. *Спицын, А. А.* Предполагаемые древности Черной Руси / А. А. Спицын // Записки императорского русского археологического общества. Новая серия. Т. XI. Вып. 1–2. Труды отделения славянской и русской археологии. – СПб., 1899. – Кн. 4. – С. 303–310.

38. *Спицын, А. А.* Производство археологических раскопок / А. А. Спицын. – СПб.: Типография главного управления уделов, 1896. – 71 с.

39. *Анучин, Д.* Погребальные обычаи / Д. Анучин // Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона. Т. XXIV: Повелительное наклонение – Полярные координаты. – СПб.: Типолитография И. А. Ефрона, 1898. – С. 38–40.

**(Дата падачы: 24.02.2022 г.)**

ISSN 2077-4885

# НАУЧНЫЕ ТРУДЫ

## Республиканского института высшей школы

*Исторические и психолого-педагогические науки*

Сборник научных статей

Основан в 2000 году

Выпуск 22

В четырех частях

Часть 2

Минск
РИВШ
2022

УДК 082

В сборник, включенный ВАК Республики Беларусь в перечень научных изданий для опубликования результатов диссертационных исследований, вошли статьи по историческим и псхолого-педагогическим наукам.

Адресован аспирантам, научным работникам, преподавателям высшей школы.

Р е к о м е н д о в а н о
редакционно-издательской комиссией
ГУО «Республиканский институт высшей школы»
(протокол № 6 от 30 декабря 2021 г.)

Р е д а к ц и о н н а я   к о л л е г и я :
пред. редкол., д-р физ.-мат. наук проф. *В. А. Гайсенок*;
д-р филос. наук доц. *И. Н. Сидоренко*;
д-р ист. наук проф. *О. Г. Слука*; д-р филос. наук проф. *В. В. Позняков*;
д-р ист. наук доц. *А. В. Мартынюк*; д-р ист. наук проф. *В. С. Кошелев*;
д-р филос. наук проф., чл.-кор. НАН Беларуси *П. А. Водопьянов*;
д-р пед. наук проф. *В. Ф. Володько*; д-р пед. наук проф. *В. В. Чечет*;
д-р психол. наук проф. *И. А. Фурманов*; д-р психол. наук проф. *В. А. Янчук*;
д-р экон. наук проф. *А. В. Данильченко*; д-р полит. наук проф. *В. А. Мельник*;
д-р полит. наук проф. *С. В. Решетников*; д-р экон. наук проф. *В. А. Воробьев*

© ГУО «Республиканский
институт высшей школы», 2022

## СОДЕРЖАНИЕ


**ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ**

*Макаренко И. А.* ПОЛИТИКА ПРАВИТЕЛЬСТВА Г. БРАУНА В ОБЛАСТИ ШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ В ВЕЛИКОБРИТАНИИ (2007–2010 ГГ.) ... 3

*Мартынюк А. В.* К ВОПРОСУ О ДОСТОВЕРНОСТИ СВИДЕТЕЛЬСТВ О СУЩЕСТВОВАНИИ БИБЛИОТЕКИ ИВАНА ГРОЗНОГО ... 14

*Масейчук Л. І.* ВЫКЛАДАННЕ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫХ ПРАДМЕТАЎ У БЕЛАРУСКІМ МЕДЫЦЫНСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ (1930–1940): РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПА МАТЭРЫЯЛАХ АРХІЎНЫХ ФОНДАЎ ... 20

*Маханько Ю. В.* АНГЛОЯЗЫЧНАЯ ИСТОРИОГРАФИЯ КУЛЬТУРНЫХ ПРЕДПОСЫЛОК БРИТАНСКОЙ ПРОМЫШЛЕННОЙ РЕВОЛЮЦИИ ... 26

*Мацулевич Е. В.* ЭВОЛЮЦИЯ ПОЛИТИКИ США В ОТНОШЕНИИ ПОСТСОВЕТСКОЙ ИНТЕГРАЦИИ В 1990-Е ГГ. ... 34

*Мелеховец В. Ф.* ВИНСЕНТ-АНСЕЛЬМ ЗЫГМУНТ – СОЗДАТЕЛЬ ДАКТИЛЬНОГО АЛФАВИТА И ПЕРВЫЙ СУРДОПЕДАГОГ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ XIX В. ... 43

*Мигун Д. А.* РАЗВИТИЕ БЕЛОРУССКО-ГЕРМАНСКИХ КУЛЬТУРНЫХ И НАУЧНЫХ СВЯЗЕЙ В ПОСЛЕРАПАЛЛЬСКИЙ ПЕРИОД ... 55

*Мизярска Н. А.* БЛАГОТВОРИТЕЛЬНАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ И МЕЦЕНАТСТВО НА ТЕРРИТОРИИ ВИТЕБСКОЙ ГУБЕРНИИ В ПОСЛЕДНЕЙ ТРЕТИ XIX – НАЧАЛЕ XX В. ... 64

*Мікалаева Л. В.* АДЛЮСТРАВАННЕ ПРАБЛЕМ КРЭЎСКАГА ДАГАВОРА І ЭВАЛЮЦЫІ ЛІТВІНСКА-ПОЛЬСКІХ УЗАЕМААДНОСІН У 1385–1392 ГГ. У ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ XIX – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТ. ... 70

*Мох Е. Н.* ПОЛИТИКА НАЦИСТСКОЙ ГЕРМАНИИ В ОТНОШЕНИИ СОВЕТСКИХ ВОЕННОПЛЕННЫХ: ОСНОВНЫЕ НОРМАТИВНЫЕ ДОКУМЕНТЫ ... 76

*Настусевич В. И.* ЦЕРКОВЬ И ГОСУДАРСТВО В ИСПАНИИ В ПЕРИОД «ВТОРОГО ФРАНКИЗМА» (1957–1975 ГГ.) ... 85

*Настусевич С. В.* ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКИЙ ПРОЕКТ «ЧЕЛОВЕК ВТОРОГО ПЛАНА» В РОССИЙСКОЙ ИСТОРИЧЕСКОЙ НАУКЕ ... 93

*Олюнин С. В.* ТУРЕЦКОЕ ИСТОРИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО: У ИСТОКОВ СОЗДАНИЯ НАЦИОНАЛЬНОЙ ИСТОРИОГРАФИИ ... 102

*Острога В. М.* УЧИТЕЛЯ БЕЛАРУСИ В ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКОМ ДВИЖЕНИИ 1870-Х – НАЧАЛА 1890-Х ГОДОВ ......... 109
*Перзашкевич О. В.* К ВОПРОСУ О ГЕОПОЛИТИЧЕСКИХ ВЗГЛЯДАХ АЛЬ-БИРУНИ ........ 117
*Пецюкевіч Т. У.* ЖЫЛЛЁВАЯ ПАЛІТЫКА Ў БССР У ПЕРЫЯД НЭПА (1921–1928 ГГ.): НА ПРЫКЛАДЗЕ Г. МІНСКА ........ 124
*Приборович А. А.* ИСТОРИЧЕСКИЙ ИСТОЧНИК В ВЕК ЦИФРОВОГО КОНТЕНТА ........ 131
*Раемский Ю. А.* К ИСТОРИИ ВОЕННОЙ ИНФРАСТРУКТУРЫ СТАВКИ ВЕРХОВНОГО ГЛАВНОКОМАНДУЮЩЕГО В МОГИЛЕВЕ: ПОДРАЗДЕЛЕНИЯ ПРОТИВОВОЗДУШНОЙ ОБОРОНЫ ........ 138
*Раюк А. Р.* ЭВАЛЮЦЫЯ ПРАСТОРАВЫХ МЕЖ «КРАЯ» У ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАГРАМАХ КРАЁЎЦАЎ-КАНСЕРВАТАРАЎ БЕЛАРУСІ І ЛІТВЫ Ў 1905–1908 ГГ. ........ 145
*Русін А. Дз.* СТАТУС ПРАФЕСІЙНАЙ ГРУПЫ МЕХАНІЗАТАРАЎ СЯРОД СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БССР У 1944–1965 ГГ. ........ 153
*Рышкевич О. И.* ИСТОРИЧЕСКАЯ ПЕРИОДИКА БЕЛАРУСИ: ПОДХОДЫ К ОПРЕДЕЛЕНИЮ И ТИПОЛОГИЗАЦИИ ........ 160
*Сакольчык А. Э.* ПАЛІЦЭЙСКАЯ РЭФОРМА 1862 Г. У БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯХ: ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА ........ 168
*Самусік А. Ф.* АДУКАЦЫЙНАЯ СПРАВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ЧАСЫ ПРАЎЛЕННЯ КАРАЛЯ СТЭФАНА БАТОРЫЯ (1576–1586 ГГ.) ........ 176
*Сацукевіч І. І.* АДЛЮСТРАВАННЕ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ Ў НАЗВАХ ПРАДМЕСЦЯЎ, УРОЧЫШЧАЎ, ПАСЁЛКАЎ І РАЁНАЎ МІНСКА Ў 1917–1944 ГГ. ........ 184
*Сенькевич О. И.* ВИЗУАЛИЗАЦИЯ ФИЗКУЛЬТУРНЫХ МАССОВЫХ МЕРОПРИЯТИЙ В 20–30-Х ГГ. ХХ В. В БССР ........ 192
*Сороковик И. А.* БЕЛАРУСЬ – РОССИЯ: СОТРУДНИЧЕСТВО В ОБЛАСТИ ЮРИСПРУДЕНЦИИ ........ 198
*Стволыгин К. В.* МОДЕЛИ АЛЬТЕРНАТИВНОЙ СЛУЖБЫ КОНЦА XIX – НАЧАЛА XXI В. ........ 205
*Стройлова Е. С.* АНАЛИЗ КНИГ ПО ИСТОРИИ, ИЗДАННЫХ В ТИПОГРАФИЯХ ВИЛЕНСКОЙ И КИЕВО-МОГИЛЯНСКОЙ АКАДЕМИЙ В XVII–XVIII ВВ. ........ 213
*Лю Сянцянь.* ТУРИСТИЧЕСКАЯ ДИПЛОМАТИЯ КИТАЯ И БЕЛАРУСИ В РАМКАХ ШАНХАЙСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ СОТРУДНИЧЕСТВА ........ 222
*Хань Ваньчэнь.* ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ КИТАЯ И УКРАИНЫ В СФЕРЕ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ В КОНТЕКСТЕ ИНИЦИАТИВЫ «ОДИН ПОЯС И ОДИН ПУТЬ» (2014 – ЯНВАРЬ 2022 ГОДА) ........ 231

*Хушваков Н. О., Богомолов Г. И.* ОБРАЗ СИЁВУША
В АРХЕОЛОГИЧЕСКИХ МАТЕРИАЛАХ
ИЗ ЯККАБАГА (УЗБЕКИСТАН) .......................................................................... 238
*Чараўко В. У.* ВЫВУЧЭННЕ ПОЗНЕСЯРЭДНЕВЯКОВЫХ
ПАХАВАЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ
Ў СЯРЭДЗІНЕ 60-Х ГГ. XIX – ПАЧАТКУ XX СТ. ............................................ 248
*Лэчжэн Чжоу.* ВНЕШНЯЯ ПОЛИТИКА КНР ПОСЛЕ
XVIII СЪЕЗДА КПК: НОВЫЕ ВОЗМОЖНОСТИ И ВЫЗОВЫ
(2012–2015 ГГ.)................................................................................................... 258
*Чэчулін З. В.* ІНВЕНТАР КРАКАЎСКАГА КАРОННАГА АРХІВА 1551 Г.
ЯК КРЫНІЦА ПА РЭКАНСТРУКЦЫІ АРХІВА
ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ (1367–1392 ГГ.) ............................................ 266
*Шимукович С. Ф.* ИНФРАСТРУКТУРА БЛАГОТВОРИТЕЛЬНОСТИ
В ГРОДНЕНСКОЙ ГУБЕРНИИ В КОНЦЕ XIX – НАЧАЛЕ XX В. ................ 275
*Шымак А. К.* СТАСУНКІ ЛЖЭДЗМІТРЫЯ І І РЫМСКАЙ КУРЫІ ............... 286
*Щавлинский Н. Б.* ИСТОЧНИКИ И ЛИТЕРАТУРА ПО ИЗУЧЕНИЮ
ДЕЯТЕЛЬНОСТИ БЕЛОРУССКИХ ОРГАНИЗАЦИЙ
И ОБЩЕСТВ В КИЕВЕ И ОДЕССЕ В 1917–1918 гг. ...................................... 292

Научное издание

# НАУЧНЫЕ ТРУДЫ<br>РЕСПУБЛИКАНСКОГО ИНСТИТУТА ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ.<br>ИСТОРИЧЕСКИЕ И ПСИХОЛОГО-<br>ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ НАУКИ

Сборник научных статей

Основан в 2000 году

Выпуск 22

В четырех частях
Часть 2

Ответственный за выпуск *Н. С. Клишевич*
Редактор *Т. М. Подоматько*
Компьютерная верстка *Н. М. Лазар*

Подписано в печать 01.08.2022. Формат 60×84/16.
Бумага офсетная. Ризография.
Усл. печ. л. 17,7. Уч.-изд. л. 21,2. Тираж 100 экз. Заказ 70.

Издатель и полиграфическое исполнение:
государственное учреждение образования
«Республиканский институт высшей школы».
Свидетельство о государственной регистрации издателя,
изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/174 от 12.02.2014.
Ул. Московская, 15, 220007, г. Минск.